БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 26 лістапада 1998 года, чацвер, № 17 (1790)

РЭКАНСТРУКЦЫЯ

ВЯЛІКІЯ ЗМЕНЫ Ў СТУДЭНЦКІМ ГАРАДКУ

Ні для каго не сакрэт, што БДУ перажывае вялікую рэканструкцыю. Рамантуюцца будынкі факультэтаў, інтэрнатаў, сталовак. Усе штосьці праектуюць, фарбуюць, рамантуюць. Не маглі не закрануць гэтыя з'явы і студэнцкі гарадок. Тут наогул, мабыць, будуць самыя вялікія змены.

Ідэя перабудовы студгарадка прыйшла яго дырэктару Ігару Раманавічу Вярэнчыкаву. Ідэя з вялікім размахам. Адразу запрацавалі архітэктары. Усё разлічылі, улічылі...

У другім інтэрнаце, які на наступны год паставяць на капітальны рэмонт, збіраюцца зрабіць двухсхільны дах, пакрыты металадахоўкай, а таксама невялікую прыбудову — спартыўную залу для патрэб тых, жыве ў гэтым інтэрнаце. Сауна, басейн, спартыўная зала — усюды можна будзе пабываць, не выходзячы з інтэрната.

Каля пятага інтэрната за сталоўкай плануецца зрабіць летнюю кавярню, накшталт "Спеўных фантанаў", і дыскатэчную пляцоўку для студэнтаў. З "пяцёркі" таксама пераязджае ўся адміністрацыя, каб вызваліць памяшканні для студэнтаў.

Два жылыя дамы па уліцы Кастрычніцкай, у адным з якіх знаходзіцца швейнае атэлье "Дожджык", гарадскія улады збіраюцца паставіць на капітальны рамонт з адсяленнем жыльцоў. БДУ будзе хадайнічаць, каб гэтыя будынкі перайшлі пад нашую "страху". Пасля рамонту за кошт БДУ там плануецца стварыць "маласямейку" для супрацоўнікаў. Паміж дамамі будзе ўзведзены будынак для адміністрацыі. У дворыку паміж гэтымі дамамі і спорткомплексам будуць крытыя гаражы.

Не абыйдзе рэканструкцыя і спорткомплекс. Добраўпарадкуюць трыбуны, на якіх з'явяцца лаўкі. Стадыён спорткомплекса — летні, што стварае пэўныя цяжкасці для футбалістаў падчас заняткаў зімой. Таму плануецца над полем зрабіць манеж.

Шостаму і сёмаму інтэрнату трэба будзе перажыць рэканструкцыю даху.

У студэнцкай кавярні за сёмым інтэрнатам размесціцца цэнтр адпачынку для супрацоўнікаў.

Будынак пад нумарам 12 па вуліцы Кастрычніцкай (былая пральня) па планах ператворыцца ў Палац культуры студэнцкага гарадка. Плануецца надбудаваць трэці паверх, у адным крыле зрабіць вялікую актавую залу, у другім — дыскатэчную, а ў цэнтральных памяшканнях размясціць студэнцкі тэатр і гурткі па захапленнях. Задні дворык зашкляць і зробяць зімні сад і кавярню.

У дварах знаходзіцца яшчэ адзін будынак, які пакуль не належыць універсітэту. Тут размесцяцца гаражы і гаспадарчыя майстэрні, якія будуць абслугоўваць увесь універсітэцкі гарадок.

Гэта ўсё пакуль у планах і праектах. А калі мары здзейсняцца, то ў Беларусі, без сумніву, будзе адзін з самых прыгожых і сучасных студэнцкіх гарадкоў.

Вольга КАЗДЗЕРКА

СІСТЭМА БЯСПЕКІ Ў ЕЎРОПЕ Ў XXI СТАГОДДЗІ

ДЫСКУСІІ ВАКОЛ НАТО ПРАЦЯГВАЮЦЦА

Праблема трансфармацыі Арганізацыі Паўночна-атлантычнага дагавору пасля сканчэння "халоднай вайны", пашырэння сферы яе ўплыву на дзяржавы Сярэдняй Еўропы — былых ўдзельніц Варшаўскага дагавору хвалюе палітыкаў, навукоўцаў, простых грамадзян, а для Рэспублікі Беларусь яна ўдвая больш актуальная. Надаючы вялікую ўвагу неабходнасці ўзгаднення самых розных меркаванняў і пазіцый з мэтай іх збліжэння, пазбаўлення ад крайнасцей і перадузятасцей у ацэнках, азнаямлення суседзяў на Захадзе і Усходзе з пунктам гледжання Беларусі, Беларускі дзяржаўны універсітэт выступае арганізатарам міжнародных форумаў па найбольш актуальных пытаннях бяспекі ў Еўропе.

10-11 лістапада на факультэце міжнародных адносін БДУ праходзіў прадстаўнічы семінар "Еўрапейская бяспека і НАТО". Ініцыятары яго правядзення — рэктарат, кафедра міжнародных адносін, памочнік Генеральнага сакратара Паўночна-атлантычнага альянсу Крыстафер Донэлі — ставілі мэту абмеркаваць канцэптуальныя падыходы да праблемы і запрасілі на яго прыхільнікаў самых розных, часам супрацьлеглых поглядаў. Сярод удзельнікаў і гасцей мерапрыемства — супрацоўнік Бюро інфармацыі і прэсы НАТО Джон Лаф, намеснік спецсаветніка Генеральнага сакратара НАТО па пытаннях Цэнтральнай і Усходняй Еўропы Ліф Спонбек, супрацоўнік аддзела партнёрства і супрацоўніцтва альянсу Крыстафер Шапарданаў, дырэктар Люксембургскага інстытута еўрапейскіх і міжнародных даследаванняў доктар Клес, загадчык аддзела міжнароднай бяспекі і раззбраення Міністэрства замежных спраў РБ В. Г. Калеснік, прарэктар Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін А. У. Загорскі; старшыня Камісіі па знешняй палітыцы і інфармацыі Парламенцкага Сходу Беларусі і Расіі М. І. Чаргінец; загадчык інфармацыйна-аналітычнага аддзела Цэнтра ваенных даследаванняў Міністэрства абароны РБ Ю. А. Тома; загадчык цыкла Ваеннай акадэміі РБ У. У. Язэпчык; прафесар гэтай самай акадэміі К. К. Волкаў; дэкан факультэта міжнародных адносін, прафесар А. В. Шарапа; намеснікі дэкана гэтага факультэта, дацэнты Л. М. Хухлындзіна і М. Э. Часноўскі; прафесары кафедры міжнародных адносін БДУ А. А. Разанаў і У. Е. Снапоўскі. Адкрыў семінар прадмовай рэктар Белдзяржуніверсітэта, прафесар А. У. Казулін, а вёў пасяджэнні прарэктар па міжнародных сувязях У. А. Астапенка. Усяго было тры пасяджэнні, названыя па тэмах: "Фарміраванне новай еўрапейскай архітэктуры бяспекі", "НАТО ў новай Еўропе", "Беларусь і НАТО: перспектывы супрацоўніцтва". Сярод мноства праблем, што закраналі ў дакладах удзельнікі, былі такія: пытанне суадносін НАТО і АБСЕ, Еўрапейскага Саюза, Заходнееўрапейскага саюза ў пабудове сістэмы бяспекі ў Еўропе; вызначэнне тэрмінаў "бяспека", "пагроза" ў новай сітуацыі на кантыненце; характарыстыка фактараў рызыкі ва ўзнікненні пагрозы новых канфліктаў і нестабільнасці ў Еўропе; нятоеснасць паняццяў "калектыўная абарона" і "калектыўная бяспека"; трансфармацыя Паўночна-атлантычнага дагавору з ваеннай ў палітычна-ваенную арганізацыю і тэмпы гэтай трансфармацыі; уклад Рэспублікі Беларусь у працэс ахову міру і бяспекі ў Еўропе, перспектывы далейшага супрацоўніцтва, магчымасці юрыдычнага замацавання адносін Беларусі і НАТО; эвалюцыя грамадскай думкі на Беларусі ў дачыненні да магчымых пагроз з-за межаў нашай краіны; характарыстыка пазіцый найбліжэйшых суседзяў Беларусі, вядучых палітычных сіл у іх да ролі НАТО ў сістэме падтрымання міру і стабільнасці. У дыскусіі гаворка ішла аб магчымых наступствах пашырэння альянсу на ўсход, аб палітыцы НАТО ў дачыненні да праблемы Косава. Нават калі погляды разыходзіліся, усе ўдзельнікі пагаджаліся ў адным, самым галоўным: усходняя мяжа блока НАТО (у блізкім будучым — беларуска-польская мяжа, а затым магчыма беларуска-літоўская, беларуска-латвійская) не павінна стаць раздзяляльным рубяжом, чарговай "жалезнай заслонай" паміж альянсам і астатняй Еўропай. Галоўная мэта семінару дасягнута. У канферэнц-зале факультэта міжнародных адносін панаваў свабодны абмен думкамі, адбываўся пошук агульнай мовы. Мерапрыемства стварала добры падмурак для наладжання сустрэч у будучым. Чакае свайго ўвасаблення ідэя аб стварэнні ў БДУ цэнтра дакументацыі НАТО. Ён, спадзяемся, адыграе не апошнюю ролю ў пераадоленні рэшткаў недавер у, што вядзецца з часоў "халоднай вайны", бо беды — ад няведання. Галоўны вынік міжнароднага семінару "Еўрапейская бяспека і НАТО", як адзначыў у заключным слове прафесар А. В. Шарапа, — тое, "што цяпер мы ведаем пазіцыі адзін аднаго".

Леанід ФЯДОТАЎ

ВІНШУЕМ!

Якраз напярэдадні выхаду ў свет гэтага нумара газеты "Беларускі універсітэт" намеснік начальніка планава-эканамічнага ўпраўлення Ларыса Аляксандраўна Сітчыхіна адсвяткавала свой дзень нараджэння.

Ларыса Аляксандраўна скончыла Беларускі політэхнічны інстытут. Доўгі час працавала ў Міністэрстве адукацыі і навукі: спачатку на пасадзе вядучага эканаміста, затым — галоўнага эканаміста планава-эканамічнага ўпраўлення. Ва універсітэт яна прыйшла на пасаду начальніка планава-фінансавага аддзела. З сакавіка 1997 года працуе намеснікам начальніка планава-эканамічнага ўпраўлення.

Радкі прафесійнай біяграфіі Ларысы Аляксандраўны, безумоўна, характарызуюць яе як чалавека мэтанакіраванага і адказнага. Але мы ў сваім віншаванні хацелі б зазначыць, што з прыходам Ларысы Аляксандраўны ва універсітэт на адну прыгожую і абаяльную жанчыну ў нас стала больш. Мы ўпэўнены, што муж і пятнаццацігадовы сын Пётр, калегі па рабоце і сябры ў сваіх віншаваннях абавязкова адзначылі гэты факт. Далучаемся да ўсіх добрых слоў у адрас імянінніцы і зычым ёй здароўя і поспехаў.

З ГІСТОРЫЯЙ НА "ТЫ"

ГЭТЫ ДЗЕНЬ У ЖЫЦЦІ УНІВЕРСІТЭТА

19.10.1928 — універсітэт наведаў А. В. Луначарскі.

20.11 — 50 год з дня нараджэння Яўгеніі Іосіфаўны Янішчыц, беларускай паэтэсы. Скончыла БДУ (1971).

21.11 — 70 год з дня нараджэння Ганны Уладзіміраўны Арашонкавай, беларускай мовазнаўцы, кандыдата філалагічных навук, дацэнта. Скончыла БДУ (1953).

26.11 — 80 год з дня нараджэння Уладзіміра Міхаўлавіча Шахаўца, беларускага пісьменніка. Скончыў БДУ (1946).

ПАСПРАБУЙЦЕ!

АБ'ЯДНАННЕ ІНТЭЛЕКТУАЛАЎ

Цяжка знайсці паразуменне з тым, хто мае інтэлектуальны патэнцыял куды меншы за твой уласны. У гэтым упэўніліся высокаадукаваныя людзі, якія вымушаны пакутаваць нікольк не менш за творчых асоб, зразумець якіх звычайныя прадстаўнікі грамадства проста не могуць.

Вось чаму яшчэ ў пачатку бягучага года беларускія інтэлектуалы стварылі сваю самую "галавастую" арганізацыю. Існуе ж сусветная арганізацыя інтэлектуалаў — "Менса". Яна аб'ядноўвае, дарэчы, прадстаўнікоў больш за 100 краін. Яе мэта — садзейнічаць развіццю бясцэннага патэнцыялу грамадства.

У Мінску ў першай тэставай сесіі ўдзельнічала звыш за 400 чалавек. Трэба адзначыць, што амаль палова з іх атрымала самую высокую адзнаку. Такая сесія адбудзецца і ў наступным годзе. У "Белменсы" ёсць і сваё друкаванае выданне, ствараецца свая база дадзеных.

Уладзімір ДРУКАЎ

ПАДПІСКА-99

Працягваецца падпіска на перыядычныя выданні на першае паўгоддзе наступнага года. У вас яшчэ ёсць час, каб забяспечыць сябе карысным і неабходным для кожнага навукоўца, выкладчыка, а таксама і для студэнтаў часопісам

"ВЕСНІК БДУ"

Навукова-тэарэтычны часопіс "Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта" выдаецца з 1969 г. У ім аператыўна асвятляюцца дасягненні беларускіх навукоўцаў у галіне фундаментальных, прыродазнаўчых, сацыяльна-эканамічных і гуманітарных навук, пытанні развіцця іх творчых сувязей з замежнымі навуковымі цэнтрамі.

Часопіс распаўсюджваецца па падпісцы і ў рознічны продаж не паступае. Асноўнымі падпісчыкамі з'яўляюцца выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты універсітэта. Аднак у апошні час наглядаецца зніжэнне тыражу часопіса, а значыць — і ўзрастанне страт ад яго выпуску. Гэта тлумачыцца перш за ўсё тым, што не ўсе выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта падпісваюцца на часопіс. Узрастанне страт можа прывесці да неабарачальных вынікаў, звязаных з далейшым функцыянаваннем выдання, таму што часопіс "Веснік БДУ" знаходзіцца на дзяржразліку.

Падпісная цана часопіса на першае паўгоддзе 1999 года такая:

Серыя I (індэкс 74851) — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 1, студзень, № 2, май) — 70000 рублёў;

Серыя II (індэкс 74852) — хімія, біялогія, геаграфія (№ 1, люты, № 2, чэрвень) — 70000 рублёў;

Серыя III (індэкс 74853) — гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, эканоміка, права (№ 1, сакавік) — 35000 рублёў;

Серыя IV (індэкс 74854) — філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 1, красавік) — 35000 рублёў.

НЯЗВАНЫ ГОСЦЬ – ПРАБЛЕМА СТУДСАВЕТА

Прайшло ўжо два з паловай месяцы навучання. Студэнты "акліматызаваліся" да інтэрната. Для нашай "дзевяткі" гэтая праблема ў гэтым навучальным годзе стаяла асабліва востра, бо яшчэ нядаўна інтэрнат быў перапоўнены і ў ім было вельмі мала першакурснікаў.

Зараз можна сказаць, што адчуваюцца значныя змены. Вялікая заслуга ў гэтым — студсавета і оператрада. У студсавет уваходзяць студэнты 2-4 курсаў, а ў оператрад — пераважна першакурснікі.

Адна з праблем, якія засталіся, — дзяжурствы на вахце і сітуацыя падчас дыскатэк на факультэце: наплывам гасцей не можа кіраваць ніякі оператрад або вахцёр. Але гэтыя праблемы можна вырашыць, бо студэнты, органы самакіравання і адміністрацыя знаходзяць паразуменне і працуюць зладжана.

А. ЧУБРЫК, старшыня студсавета інтэрната № 9

ТРАНСПАРТ, ТЭЛЕФОН І ГАРАЧАЯ ВАДА

ФПМІ ў 1998—99 навучальным годзе перасялілі ў іншы інтэрнат. З пераездам на новае месца пражывання да старых праблем дадаліся новыя. Узноўленая традыцыя "круглага стала" прыйшлася вельмі дарэчы.

У чацвер, 11 лістапада, у інтэрнаце № 3 прайшоў "круглы стол". На яго былі запрошаны прадстаўнікі кіраўніцтва універсітэта, студэнцкага гарадка, дэканы факультэтаў ФПМІ і гістфака, адміністрацыя інтэрната, а таксама прадстаўнікі прафсаюза і Студэнцкага саюза. Уздымаліся пытанні каардынацыі працы адміністрацыі інтэрната і студэнцкага савета. Ад студсавета паступіла прапанова аб перагляде становішча і статусу оператрада. Яшчэ раней студсавет паведамляў у студэнцкі гарадок пра нездавальняючую работу вахты. І гэтае пытанне зноў было ўзнята на "круглым стале". Адміністрацыя студгарадка паабяцала разабрацца з гэтай праблемай.

Праблему транспарта, якая асабліва хвалявала студэнтаў, рэктарат ужо спрабаваў вырашыць шляхам увядзення спецыяльнага маршрута зранку.

Уздымаліся таксама пытанні па адсутных пасадах спортарганізатара, педагога-арганізатара, а таксама па фінансаванню мерапрыемстваў, якія мяркуецца праводзіць у інтэрнаце. З набліжэннем сесіі ўзнікла таксама пытанне аб падрыхтоўцы чытальных залаў, пра што студсавет прасіў адміністрацыю студгарадка і інтэрната.

Апрача таго, студэнцкі савет папрасіў разгледзець магчымасць замены гарадскіх тэлефонаў на універсальныя. Праблему адключэння вады на ноч, якая хвалюе ўсіх, студгарадок абяцаў вырашыць.

Студэнцкі савет спадзяецца, што ўсе абмеркаваныя праблемы будуць вырашаны ў вельмі недалёкай будучыні.

ШАМАНЫ Ў БДУ?

Фундаментальная і нетрадыцыйная медыцына – гэтыя, здавалася б, антаганічныя паняцці будуць аб'яднаны на новым факультэце нашага універсітэта.

Паяўленне будучых медыкаў пад дахам БДУ зусім не сведчыць пра тое, што выпускнікі нованароджанага факультэта цалкам выцясняць з рынку працы спецыялістаў, якіх вось ужо не адно дзесяцігоддзе рыхтуе медыцынскі інстытут. Па меркаванню арганізатараў новай справы, сёння ўжо відавочна, што магчымасці іх інтэграцыі ў еўрапейскую сістэму аховы здароўя абмежаваны: адрыў сістэмы медыцынскай адукацыі ад патрэб сучаснага жыцця, які адбыўся ў свой час з-за неабходнасці масавай падрыхтоўкі медыкаў-практыкаў, цяпер выяўляе свае недахопы. Рэспубліка ўжо адчувае дэфіцыт медыкаў прагрэсіўнага ўзроўню, якія б валодалі базавымі медыка-біялагічнымі ведамі і метадамі народнай і нетрадыцыйнай медыцыны.

Добра вядома, што фундаментальныя веды чалавецтва пра жывую матэрыю, норму і паталогію чалавека накопліваліся стагоддзямі. Эфектыўная дыягностыка і лячэнне самых розных захворванняў існавалі ў Егіпце і Кітаі яшчэ 5-7 тысяч гадоў назад. А знахары і шаманы Поўначы да гэтага часу лечаць усе немачы без лекаў і скальпеля. Аднак медыцына сучаснага урбанізіраванага свету па-ранейшаму пагарджае гэтым вопытам. Нярэдка бездапаможнасць медыкаў падштурхоўвае пацыентаў звяртацца да бабак. Эфектыўнасць іх замоваў і прымочак настолькі вялікая, што часта нават афіцыйная медыцына вымушана прызнаць гэтыя народныя метады лячэння.

Напрыклад, у Еўропе і ЗША 30 працэнтаў пацыентаў звяртаюцца да спецыялістаў нетрадыцыйнай медыцыны. Тлумачэнне гэтаму, зразумела ж, ёсць: у класічнай навуковай медыцыне падчас хуткага пазбаўлення ад сімптомаў за пацыентам цягнецца доўгі "хвост" алергічных наступстваў. Таму на Захадзе мільярды долараў ідуць у нетрадыцыйную медыцыну – усходнюю терапію, хірапрактыку, натурапатыю, фітатэрапію. Нават у Расіі і на Украіне заканадаўчыя акты дазваляюць сёння займацца альтэрнатыўнай медыцынай, у тым ліку і людзям без спецыяльнай медыцынскай адукацыі, якія маюць прыродны дар.

На Беларусі такія законы яшчэ не прыняты. Таму медыцынскі факультэт Белдзяржуніверсітэта стане не толькі вучэбнай установай, але і лячэбна-прафілактычнай структурай з унікальным узроўнем апаратнага і кадравага забеспячэння.

Першыя ж крокі факультэта будуць звязаны з падрыхтоўкай эканамістаў, менеджэраў аховы здароўя і страхавой медыцыны, а таксама псіхолагаў па аказанню медыка-сацыяльнай дапамогі насельніцтву. Плануецца, што заняткі пачнуцца не пазней за 1 снежня бягучага года. Паступіць на гэтыя спецыяльнасці змогуць і школьнікі, і ўрачы, і спецыялісты з вышэйшай адукацыяй. А з наступнага года спектр спецыяльнасцей, якія прапануюцца, значна пашырыцца.

ДВАЦЦАЦЬ ВОЛАТАЎ-МАТЭМАТЫКАЎ

Дазвольце запытацца, як вы адзначалі сваё прафесійнае свята. Спадзяюся, што побач былі сябры, не студэнцку багаты стол (што вельмі дзіўна напярэдадні стыпендыі), напоі легендарных беларускіх прадпрыемстваў... І вядома ж, багата музыкі, скокаў, віншаванняў свайму брату-студэнту, выкладчыкам і проста добрым людзям, якія на свята не забыліся. Не забыліся на яго і жыхары інтэрната № 7. Праўда, яны зайздросцілі шчасліўчыкам з інтэрната № 5, дзе 17 лістапада адбыўся грандыёзны фэст "5 гадоў за 5 гадзін". На ім пабывалі 150 чалавек з "сямёркі"(і вярнуліся з найлепшымі ўражаннямі), а астатнія наладжвалі сабе свята самі. Хтосьці збіраўся ў групы на кватэрах мінчукоў, нехта трапіў на "Парадыз", больш прагрэсіўныя збіраліся на дыскатэку "Ваўчок" ("Юла"). Аднак большасць прыберагала сілы для святочнай дыскатэкі, якая мелася адбыцца, па абяцанню адміністрацыі, на наступны дзень, 18 лістапада.

І ён прыйшоў. Нічога не прадвяшчала бяды. Да пачатку святочнай праграмы заставаліся лічаныя гадзіны, калі высветлілася, што няма доброаахвотнікаў у 10-градусны мароз прынесці апаратуру са студэнцкага гарадка. Заплакаў брат-студэнт, а з ім і шматлікія госці. Нічога не паробіш — на першым паверсе з'явілася аб'ява: "Дыскатэкі не будзе". Як з-пад зямлі адразу з'явіліся каля 20 асілкаў (і не зусім), здольных прынесці гэтую злашчасную апаратуру.

На жаль, гісторыя не данесла да нас імёны волатаў. Вядома толькі, што фарміраваўся атрад з хлапцоў-матэматыкаў, якія жывуць недзе на 10-12-м паверхах. Дзякуй вам!

Эльвіра ЧАРНАКНІЖЫНА

ДЗЯКУЙ ЗА "ПАРАДЫЗ"!

Гадавіну БДУ і Дзень студэнта заўжды чакаюць з вялікім нецярпеннем. Вось і сёлета дырэкцыя студгарадка БДУ пастаралася арганізаваць дзве дыскатэкі, прысвечаныя гэтым святам, у фае інтэрната № 5. Былі тут і разнастайныя конкурсы, пераможцам якіх уручаліся памятныя прызы.

Але асаблівую падзяку трэба выказаць дырэкцыі за правядзенне дыскатэкі "Парадыз" у ноч з 18 на 19 лістапада (яна прысвячалася Дню студэнта) і, вядома ж, за арэнду добрага памяшкання. Студэнты "адарваліся" на славу!..

Студэнты інтэрната № 2

САМАЕ ГАСЦІННАЕ СВЯТА

17 лістапада — свята ўсіх, хто быў, ёсць ці будзе студэнтам. Гэта разумеюць усе. Таму і ў нашым інтэрнаце № 9 свята прайшло як мае быць.

Студэнты пакояў, якія занялі першае і другое месцы па санітарным стане за верасень—кастрычнік, атрымалі білеты на дыскатэку ў інтэрнат № 5, дзе выдатна павесялліся. Астатнія ж святкавалі дома.

Але якое свята без гасцей? Наш інтэрнат можа справядліва лічыцца самым гасцінным у БДУ. Але ўсе: і госці, і гаспадары — адзначылі гэты незвычайны дзень вельмі годна. Такога парадку і чысціні пасля цудоўнага святкавання наш інтэрнат не ведаў ужо некалькі гадоў. За гэта трэба падзякаваць старастам, асабліва старасце другога паверха Каці Свірыдавай. І ўвогуле, дзякуючы свядомасці гасцей і гаспадароў пакояў у оператрада амаль не было працы. Дзякуй! Так трымаць!

А. ЧУБРЫК, старшыня студсавета інтэрната № 9

ЯНА ПЕРАСЯКАЛА РАКУ ЧАСУ, СКІРОЎВАЮЧЫ

Калісьці мы вучылі яе. Цяпер на прыкладзе яе жыцця і творчасці мы навучаем сённяшніх студэнтаў. Яе паэзія прываблівае, нават самая ранняя, вучнёўская, а таксама тая, што напісана ў студэнцкія гады падчас вучобы ў БДУ, быццам усё, што яна пісала, ужо тады разлічвалася на вечнасць, на доўгае і несмяротнае жыццё. Яна — паэтка Яўгенія Янішчыц — не хадзіла ў пачаткоўцах, а ўварвалася ў беларускую паэзію неяк адразу, маланкава, імгненна, магутна і велічна, па-майстэрску і стала.

Так заўжды здараецца, калі творчая асоба аднойчы адчувае ў сабе дар Божы. Абуджаецца жаданне выказацца, паспавядацца, пісаць пра вечнае, абагульняючы самы дробязны факт з уласнага жыцця і жыцця блізкіх і дарагіх людзей, з жыцця грамадства, навечна звязваючы свой лёс з лёсам народа і краіны. Пачынаеш гаварыць ад імя ўсяго пакалення, раптам вясновым жаўранкам сягаючы ў паднябесную вышу, уздымаючыся над паўсядзённасцю побыту і быцця, свабодна спяваючы сваю задушэўную і захапляльную песню над узараным полем ці свежаскошаным лугам, над вірлівай у лазняках рэчкай, над роснымі травамі, над задумлівай сіняй наміткай далёкага вострazубага лесу, над пагоркамі і курганамі, якіх так шмат раскідана на нашай дарогай і любай сэрцу зямлі.

Чатыры сцяны мае дом, ёсць чатыры бакі свету, чатыры крыжавыя дарогі. Чатыры плыні і чатыры стыхіі ўмоўна можна вылучыць у сучаснай беларускай паэзіі. На фоне ўсёй беларускай вершаванай творчасці ярчэй бачыцца бліскавічна-светлая паэзія Яўгеніі Янішчыц.

Найперш філасофская плынь — вершы-верлібры выдатнага паэта славянскага свету Максіма Танка ці свабодныя вершы. Свабодныя ад рыфмы, а часам — і ад размеранага рытму. Гармонія, якая вырастае са сплаву думкі і пачуцця: верш-роздум, верш-развага, верш-экспромт, які нараджаецца на нашых вачах. Аналітычная, інтанацыйная філасофская лірыка. Наватарская па сваёй сутнасці. З ёй звязаны творы-папараджэнні, творы-сігналы, дзе выразна абазначыўся "чалавечы знак", вершы пра справы зямныя і незямныя Анатоля Вярцінскага, а таксама "паэтычныя навацыі" — версэты, квантэмы, хоку Алеся Разанава. Тут жа ласкава-філасофскі паэт Алег Лойка, як яго па-сяброўску назваў Рыгор Барадулін, а таксама "зашыфраваны" Янка Сіпакоў, глыбакадумны Пятрусь Макаль і інш.

Далей вызначаем паэзію грамадзянскага пафасу, дзе голас паэта гучыць набатна, заклікальна, калі паэт працуе, перасцярагае, сцвярджае. Тут "пропаведзь" і "споведзь" з'яднаны ў адно цэлае, тут "лірыка" і "публіцыстыка" з'яднаны між сабой нябачнымі нітамі, дыфузійна спаяныя, змацаваныя, сплеценыя, яны ўяўляюць сабой адзінае выбуховае рэчыва паэзіі, якая ідзе ад сэрца. Яна ўзнікае, калі паэту цесна ў межах свайго паэтычнага сэрцабіцця і ён спавядаецца, заглыбляецца ў нетры сваёй душы, а паспавядаўшыся і "выкрычаўшыся", адкрыўшы ўсім сваё аголенае сэрца, прапаведуе нейкія свае зусім канкрэтныя і рэальныя, агульнапрызнаныя і вядомыя усім ісціны, а часамі і зусім аднадзённыя газетныя лозунгі. Кожны такі верш — учынак. Кожны радок — не з катла пар, не для ліслівасці, а ўдар у твар любой несправядлівасці. Гэта ваяўнічая, баявая, наступальная, канфліктавая і зусім нязвыклая паэзія Пімена Панчанкі, Рыгора Барадуліна, Васіля Зуёнка, Генадзя Бураўкіна, Леаніда Галубовіча, Анатоля Сыса. "Без чалавечнасці не будзе вечнасці" ці "Хто уладарыць — той і ўдарыць" — такія вершаваныя праграмныя сентэнцыі Пімена Панчанкі.

А трэцяя сцяна вырастала, як трэцяя рака, выцякала... з народнага ручайка, выплывала, бруілася, крынічыла на любай і дарагой нам усім роднай глебе. Гэта творы, якія сваім з'яўленнем у многім абавязаны народнай традыцыі, якія выраслі на падмурку вусна-паэтычнай творчасці нашага народа, увабралі ў сябе лад і склад беларускай народнай песні.

У такіх творах моцны фальклорны пачатак. Паэты праяўляюць асаблівую ўвагу да трапнага і дакладнага слоўца, у іх вершах вялікую ўдзельную вагу маюць сатыра і гумар, тут выяўляецца народны позірк на рэчы і з'явы, адбываецца духоўнае адкрыццё народа, выяўляецца народны светапогляд і народнае светабачанне. Гэтай арыентаванасцю на фальклор, на слова новае, незацяганае, пошукі вобраза, хлёсткага, пякучага, а таксама будзённага ды жыццёвага, пявучага, думак мудрых, але не мудрагелістых, сэнсу простага, ды не спрошчанага, вылучаліся і вылучаюцца творы Петруся Броўкі, Ніла Гілевіча, Анатоля Грачанікава, Міколы Чарняўскага, Міколы Аўрамчыка і інш.

Чацвёртая плынь — класічная, якая з першых крокаў увабрала ў сябе купалаўска-коласаўскую традыцыю: паэзія Аркадзя Пысіна, Сяргея Грахоўскага, Сцяпана Гаўрусёва і іншых. Нездарма Аркадзь Куляшоў так выдатна перакладаў на беларускую мову класічную рускую паэзію А. С. Пушкіна і М. Ю. Лермантава.

Узвершвае гэтую піраміду, плыні, сцены роднага паэтычнага дома жаночая паэзія. Яна — своеасаблівая, непаўторная, незвычайная, адметная. І надзвычай моцная ў эстэтычных адносінах, душэўная, трапяткая, шчымлівая, узнёслая, шчырая і праўдзівая. Жаночая паэзія — споведзь-аблягчэнне, плач-кленіч, лірыка пратэсту душы і цела супраць марнатраўства жыцця. Часамі гэта лірыка "плачу без слёз", драматычная паэзія страт чалавечых, пакут душэўных, паўсядзённых згрызот і мітрэнг. Імя ім — легіён. У беларускай паэзіі не было народных паэтаў-жанчын, але слаўных паэтэс — шмат з самых далёкіх часоў.

Назавём сённяшніх: Раіса Баравікова, Ніна Мацяш, Вольга Іпатава, Галіна Каржанеўская, Таіса Бондар, Валянціна Коўтун, Людміла Паўлікава, Валянціна Аколава.

Сярод выдатных жанчын-паэтэс асобна стаіць імя Яўгеніі Янішчыц. Сваёй зіхоткасцю, бліскавічнай яркасцю і вясёлкавасцю, рознакаляровасцю, непаўторнасцю мелодыі душы і сэрца, гарманічнасцю пачуцця і думкі, сплавам глыбокіх душэўных перажыванняў з глыбокай філасафічнасцю, якое ўключае ў сябе настаўніцтва і прароцтва. Прароцтва душы і прадчуванні сэрца і розуму. Ёй было лёгка і цяжка ў атмасферы, дзе насцярожліваацэнава ставіліся да розуму дасведчанага да таленту яркага і самабытнага, да голасу нязвыклага, калі не крычыш, а людзі цябе ўсё роўна чуюць, каму трэба пачуць, калі не набіваешся на любоў і прызнанне, ты пазбягаеш яе, туляешся, а яны самі знаходзяць цябе — тая вялікая любоў і прызнанне ўсяго народа.

Як і ва ўсе стагоддзі пранікліві і дасведчаны розум з'яўляецца галоўным вяршыцелем чалавечых лёсаў. Гора ад розуму?.. Што так? У ананімнай паэме 70-гадоў, у зробленым пад народны "Сказе пра Лысую гару" сярод іншых заган нашага часу адзначалася нясцерпнае жаданне многіх чыноўнікаў "ажыццявіць" "святы" парыў — ліквідаваць дашчэнту мову, якой Купала гаварыў". Далей сказана:

Але назло іх крыкі
"знішчыць!"
З глыбінь народнага жыцця
Увысь ірвалася Янішчыц —
Палесся мілае дзіця.

"Мілае дзіця" беларускага Палесся шмат зрабіла ў беларускай літаратуры, пакінула яркі след пасля сябе сваёй творчасцю, хоць і пражыла вельмі мала.

Па сутнасці, уся паэтычная творчасць выхаванкі філалагічнага факультэта развівалася ў межах універсітэцкага паэтычнага асяроддзя нават і тады, калі паэтэса ўжо была не звязана з родным БДУ ні вучобай, ні творчай працай у студэнцкім агульнаўніверсітэцкім літаб'яднанні "Узлёт".

"ВЫШЭЙ ПЛЫНІ..."

Яўгенія Янішчыц — найперш універсітэцкая паэтэса. Тут, у БДУ, усе радасці яе, усе поспехі, усе карані паэтычнай сталасці, вытокі прафесійнага росту. Але і паэзія яе — акадэмічная, класічная, стройная і строгая. Яўгенія Янішчыц нарадзілася 20.11.1948 года ў вёсцы Рудка Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў 1971 годзе. Паэтычны ўзлёт яе быў камсамольска-іскрыстым, зіхоткім, палымяна-трапяткім. Яна працуе ў маладзёжных арганізацыях і маладзёжным друку. У 1981 годзе маладая паэтэса-камсамолачка як сябра афіцыйнай дэлегацыі БССР удзельнічала ў рабоце XXXVI сесіі Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Як мог беларускі пісьменнік у той час трапіць у Амерыку? Толькі ў складзе афіцыйнай дэлегацыі. Гэта лічылася добрай палітычнай праверкай. І тых, хто выдатна прайшоў падобнае "выпрабаванне", але не паддаўся "тлятворнаму" ўплыву "гнілога" Захаду, той меў права разлічваць на асаблівую прыхільнасць улады, таго чакаў "рост" па адміністрацыйнай і прафесійнай лініі дзейнасці.

З Яўгеніяй Янішчыц гэтага не адбылося і не магло адбыцца. Яна была паэтам, а гэта — найвышэйшая пасада сярод людзей, магутнага "племені зямлян". Яна не імкнулася да пасад і званняў.

Паэтэса Яўгенія Янішчыц выдала шэраг зборнікаў паэзіі: "Снежныя грамніцы" (1970), "Дзень вечаровы" (1974), "Ясельда" (1978), "На беразе пляча" (1980), "Пара любові і жалю" (1983), "Каліна зімы" (1978), кнігу вершаў і паэм "У шуме жытняга святла" (1988).

Прызнанне прыйшло хутка. Яўгенія Янішчыц стала Лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, а затым ёй была нададзена Дзяржаўная прэмія БССР імя Янкі Купалы.

Паэтэсы не стала 25.11.1988 года. У адначассе, на ўзлёце, на ўздыме. Дзіка і незразумела. Яна "кінулася з вышыні ў чорную бездань начы"... Але не ў забыццё.

Паэзія Яўгеніі Янішчыц — паліфанічная, гарманічная, узнёслая, але і зямная, настраёвая. Вершы-субяседнікі праходзяць перад намі яшчэ са студэнцкіх гадоў як даўнія знаёмыя, шчырыя суразмоўцы, якія закранаюць усё, што хвалюе малады розум. Гэта — паэзія ведаў, паэзія адкрыцця, дзе простыя радкі і простыя думкі, дзе гучыць музыка сэрца. Перагукваюцца ледзь улоўныя гукі і глыбокія сэнсы, у якіх яркі і непарадавальны гукавы малюнак, дзе праходзіць парад-агляд смелых нечаканых вобразаў, дзе дакладнае і ўзвышанае слова перадае заўсёды зменлівую рэчаіснасць, грацыю душы і адкрывае вечна маладое жыццё...

Пражыць з каханнем! Гэта не проста. Але гэта і так лёгка. Як у Яўгеніі Янішчыц, радкі

Ты пакліч мяне. Пазаві
Сто дарог за маімі
плячыма.
Пачынаецца ўсё з любві.
А інакш і жыць немагчыма.

якой аб каханні, любові сёння памятаюць многія і многія, хоць ніколі не завучвалі іх па-школьнаму. Класічныя радкі!

Яна грэбла на чаўне па хуткай хвалі, ведаючы, што плынню ўсё роўна "знясе". Яна бачыла далей. Ведала больш. Адчувала танчэй. Яна перасякала раку часу, кіруючыся заўсёды ў сваіх маральных пошуках "вышэй плыні". Чытаем радкі вершаў таленавітай паэтэсы:

І ты душой не крыві
На дарозе жыцця шырокай.
Пачынаецца ўсё з любві —
Першы поспех і першыя
крокі.

Выдатныя вершы. А напісаны яны яшчэ зусім юнай паэтэсай-студэнткай, напісаныя менавіта ў БДУ, на пачатку універсітэцкага шляху. "Здравствуй, племя, младое, незнакомое!" Як не прыгадаць тут А. С. Пушкіна?

Але гэта ўжо няхай будзе адрасавана маладым паэтам.

І любоў паклікала Яе...
І голас паэтэсы адгукнуўся ў любові...

Уладзімір НАВУМОВІЧ,
загадчык кафедры
Беларускага дзяржаўнага
універсітэта, пісьменнік

ПСІХАЛАГІЧНЫ ПРАКТЫКУМ

НЕ ЎПЭЎНЕНЫ? ПРАЙДЗІ ТЭСЦІРАВАННЕ

Набыццё канкрэтных псіхалагічных ведаў неабходна кожнаму чалавеку. Псіхалагічныя веды дапамагаюць фарміраванню адэкватнай самаацэнкі, спрыяюць паспяховай адаптацыі ў новым соцыуме, развіццю ўменняў і навыкаў па пабудове міжасабовых адносін. Можна сказаць, што псіхалагічная адукаванасць з'яўляецца сацыяльна значным фактарам сучаснага жыцця.

У сацыяльна-псіхалагічным цэнтры студгарадка БДУ распрацавана праграма "Псіхалагічны партрэт асобы", якая ўключае раздзелы "Дыягностыка базавых уласцівасцей асобы", "Індывідуальна-псіхалагічныя асаблівасці", "Дыягностыка інтэлекту", "Прафарыентацыя" і мноства іншых, дзякуючы чаму можна атрымаць шматгранную інфармацыю аб асобе. Большасць тэкстаў існуе ў камп'ютэрных варыянтах, што значна паскарае працэс апрацоўкі інфармацыі і яе інтэрпрэтацыі.

Практыка паказала, што ў студэнтаў найбольшую цікавасць выклікаюць тэсты, звязаныя з дыягностыкай індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцей, асабістых якасцей і інтэлекту.

У сацыяльна-псіхалагічным цэнтры для дыягностыкі асабістых якасцей прымяняюцца тэсты як айчынных псіхолагаў, так і адаптаваныя варыянты тэстаў вядомых замежных псіхолагаў: тэсты Баншчыкава і Айзенка для вызначэння тыпу тэмпераменту, тэст Шмішака для дыягностыкі акцэнтуацый (пэўнага накірунку характару), апытальнік PEN для вызначэння ўзроўняў нейратызму і псіхатызму. Шматфактарны апытальнік асобы Кэтэла дазваляе атрымаць разнастайную інфармацыю аб індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцях чалавека. Тэст MMPI (Мінесоцкі шматмерны асобасны пералік) не толькі дае інфармацыю аб уласцівасцях асобы, але і фарміруе прафарыентацыйную гістаграму. Тэст швейцарскага псіхолага Люшэра за кароткі час можа даць глыбокую і вялікую, вольную ад свядомага кантролю выпрабуемага характарыстыку яго ўнутраных дыспазіцый. Прымяненне тэста не абмяжоўваецца ні інтэлектуальнымі, ні моўнымі, ні ўзроставымі рамкамі. Тэст працуе нават у тым выпадку, калі выпрабуемы, як яму здаецца, спецыяльна выбірае не тыя адказы.

Для вызначэння ўзроўню інтэлекту выкарыстоўваюцца як асобныя тэсты, так і батарэі, якія ўключаюць часам да 9 субтэстаў. Напрыклад, тэст Амтхаўэра ўяўляе з сябе батарэю тэстаў, якія дыягнастуюць здольнасці да абстрагавання, абагульнення, запамінання, матэматычныя здольнасці, камбінатарнае і прасторавае мысленне, прасторавае ўяўленне. Батарэя тэстаў "Джаспер" дазваляе не толькі вызначыць узровень інтэлекту, але і прадыягнаставаць індывідуальна-псіхалагічныя асаблівасці. З дапамогай тэста "Прагрэсіўныя матрыцы Равена" вызначаецца ўзровень лагічнага мыслення, каэфіцыент інтэлекту (IQ) — з дапамогай вербальнага тэста Айзенка.

У працэсе тэсціравання можна многае даведацца пра сябе, пра свае магчымасці, здольнасці, усвядоміць сябе асобай з індывідуальнымі якасцямі, паглыбіць веды аб псіхалогіі, навучыцца правільна будаваць свае адносіны з навакольнымі.

Мы запрашаем вас наведаць сацыяльна-псіхалагічны цэнтр студэнцкага гарадка. Ён працуе ва ўсе рабочыя дні з 9.00 да 16.30 па адрасу: вул. Кастрычніцкая 4-105, тэл. 227-10-74.

Н. С. ДАНІЛАВА, псіхолаг студэнцкага гарадка

"МАШЫНА ЧАСУ–98"

20 лістапада адбылося ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу аўтадызайну "Машына часу-98". Сярод удзельнікаў гэтага конкурсу было нямала навучэнцаў беларускіх навучальных устаноў. Яны прадстаўлялі свае праекты па двух намінацыях: "Аўтамабіль у горадзе" – пад дэвізам "Пакаленне "Гольф" і "Грузавы аўтамабіль заўтра". Да ўдзелу не дапускаліся работы з выявамі ўжо існуючых аўтамабіляў.

Упершыню конкурс аўтадызайну быў арганізаваны рэдакцыяй газеты "Пераходны ўзрост" у 1995 годзе. Тады амаль усе прысланыя малюнкі былі зроблены "пад капірку", і толькі тры-чатыры чалавекі даслалі арыгінальныя працы. На наступны год рэзка



ўзрасла колькасць удзельнікаў (больш за сто чалавек) і абсалютная большасць работ была арыгінальнай.

З 1997 года конкурс праводзіцца пры падтрымцы Дзяржаўнага камітэта па справах моладзі Рэспублікі Беларусь у рамках Праграмы першачарговых мер па развіццю навукова-тэхнічнай творчасці, вынаходніцтва і рацыяналізатарскай дзейнасці моладзі нашай краіны. У тым жа годзе была зарэгістравана рэкордная колькасць удзельнікаў: больш за 200 чалавек. Цікава, што ўпершыню свае працы сталі дасылаць дзяўчаты. Вынікам конкурсу стала перасоўная Выстава лепшых працаў юных аўтадызайнераў. Яе пабачылі наведнікі Палаца культуры прафсаюзаў, кінатэатра "Піянер" і Мінскага міжнароднага аўтасалона.

Сёлета ў састаў арганізатараў увайшла рэдакцыя папулярнай газеты "Аўтабізнес-weekly", а генеральнымі спонсарамі выступілі ЗП "Аўтахаўс Атлант-М" і рэдакцыя газеты "Турызм і адпачынак". Спонсарскую падтрымку аказаў таксама Мінскі аўтамабільны завод. Яго прадстаўнікі, дарэчы, адзначылі, высокі ўзровень прафесіяналізму і арыгінальнасць мыслення маладых дызайнераў і нават папрасілі дазволу арганізатараў на тое, каб выстава аўтарскіх праектаў нейкі час праходзіла на заводзе.

Да конкурсу аўтадызайну вялікі інтарэс выказалі таксама Нацыянальны цэнтр дызайну і кафедра дызайну Беларускай акадэміі мастацтваў.

Значнасць і аўтарытэт конкурсу аўтадызайну штогод павышаецца. Аб гэтым яскрава сведчыць рост колькасці ўдзельнікаў, ўзрастанне ўзроўню іх майстэрства, пашырэнне геаграфіі дасланых працаў. Сёлета, напрыклад, у аргкамітэт паступілі працы нават з Камсамольска-на-Амуры. Для актыўных удзельнікаў конкурсу праводзіліся два адукацыйныя семінары з наведаннем сервіснага цэнтра "Фольксваген" і прадпрыемства "Белкамунмаш", дзе яны пабачылі вытворчы



цыкл па выпуску айчыннага тралейбуса. У гэтым годзе (і гэта адзначалі ўсе прысутныя спецыялісты і члены журы) большасць эскізаў вызначалася арыгінальнасцю і наватарскімі тэхнічнымі рашэннямі, а працэнт скапіраваных аўтамабіляў складаў менш адзінкі. Цікава зазначыць, што ўпершыню высокіх адзнак журы дамагліся працы 15-гадовых удзельнікаў.

Дыплом III ступені, грашовую прэмію і фотаапарат "Кодак" атрымаў мінчанін Андрэй Фандзюхін. Другое месца заняў васемнаццацігадовы жыхар Пінска Андрэй Руско, які атрымаў магнітафон "Панасонік" і грашовую прэмію. Першае – Дзмітрый Юртаеў, які вучыцца ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце. Дзмітрый атрымаў у якасці прыза тэлевізар "Гарызонт", грашовую прэмію і турпуцёўку ў Чэхію.

БАЦЬКОЎ ТАКСАМА ТРЭБА ВЫХОЎВАЦЬ

Праблема педагагічнай асветы бацькоў вельмі актуальная ва ўмовах рэформы сістэмы адукацыі. Назапашаны вопыт педагагічнай практыкі на кафедры педагогікі сведчыць аб значных рэзервах удасканалення гэтых ведаў.

Педагагічная практыка паказвае, што ёсць сур'ёзныя пралікі ў педагагічнай асвеце: сістэма аўтарытарнага выхавання, якая захавалася да сённяшняга часу; адсутнасць навуковай інфармацыі па праблемах выхавання і іншыя.

На кафедры педагогікі распрацавана навукова абгрунтаваная сістэма прапаганды ведаў сярод бацькоў, якая з'яўляецца адным з важнейшых элементаў дасягнення гармоніі паміж БДУ і сям'ёй, павышэння выхаваўчага патэнцыялу сям'і. У ёй адлюстравана жаданне ў працэсе педагагічнай практыкі студэнтаў БДУ сфарміраваць цікавасць да псіхолага-педагагічных ведаў: паспрыяць вырашэнню канкрэтных педагагічных задач ва ўмовах сямейнага выхавання; садзейнічаць агульнай і педагагічнай культуры асобы.

У адпаведнасці з пастаўленымі мэтамі і задачамі студэнты філфака беларускага аддзялення БДУ пазакласную работу будавалі на наступных прынцыпах:

— навуковасць ведаў, адлюстраванне ў іх сучасных даследаванняў у галіне педагогікі;

— адзінства педагагічных ведаў і выхаваўчай практыкі;

— спалучэнне калектыўных, групавых і індывідуальных формаў работы;

— сістэмнасць у прапагандзе педагагічных ведаў.

Зместам педагагічнай асветы бацькоў на працягу педагагічнай практыкі з'явіўся шэраг наступных праблем:

— юрыдычная адказнасць бацькоў за выхаванне дзяцей (Правы дзіцяці. Канвенцыя ААН аб правах дзіцяці. Закон РБ "Аб правах дзіцяці");

— фарміраванне асобы дзіцяці, сацыяльныя і сацыяльна-педагагічныя фактары развіцця, роля асяроддзя ў развіцці асобы дзіцяці;

— сацыяльна-педагагічныя наступствы жорсткага абыходжання з дзіцём;

— развіццё пазнавальных здольнасцей дзіцяці, фарміраванне яго інтарэсаў;

— эстэтычнае выхаванне.

На педагагічнай практыцы студэнты прымянялі традыцыйныя формы педагагічнай асветы бацькоў: лекцыі, педагагічны практыкум, педагагічны трэнінг, канферэнцыі, "круглыя сталы", вечары пытанняў і адказаў. Выбар формаў асветы не насіў зададзены характар. Усё залежала ад канкрэтных умоў рэалізацыі мэт і задач асветы. У якасці прыкладаў прывядзём найбольш нетрадыцыйныя канферэнцыі: "Соцыум і выхаванне", "Сям'я сёння", "Бацькі і дзеці: супрацьстаянне ці супрацоўніцтва?", лекторый "Пра вас і для вас, бацькі", "Як выхаваць здаровае дзіця".

Напрыканцы хочацца адзначыць добрасумленныя адносіны да сваіх абавязкаў студэнтаў філфака беларускага аддзялення.

Сярод іх: Каладзінская Вольга, Ачыновіч Святлана, Дзівакова Святлана, Дзямбіцкая Святлана, Ражанец Жанна, Шахрай Наталля.

І. Я. ЗВОНІК

АСНОВА ЖЫЦЦЯ

Магчыма, некаму здаецца, што спецыялізацыя кафедры фізіялогіі і біяхіміі раслін вельмі вузкая. Дасведчаныя ж у тым, што фізіёлага-біяхімічныя працэсы складаюць аснову жыццядзейнасці ўсіх арганізмаў, разумеюць, што гэта не так. Задача кафедры — падрыхтоўка спецыялістаў міждысцыплінарнага профілю, здольных вырашаць задачы як у галіне фізіялогіі і біяхіміі раслін, так і ў галіне фізіка-хімічнай біялогіі, экалогіі і біятэхналогіі.

Кафедра заснавана ў 1928 годзе. Першым яе загадчыкам быў вядомы фізіёлаг і біяхімік раслін акадэмік АН БССР Ціхан Мікалаевіч Годнеў. На кафедры вядуць заняткі 7 выкладчыкаў, сярод якіх адзін прафесар і тры дацэнты. У 1997 годзе пры кафедры створана навукова-даследчая лабараторыя фізіялогіі раслінной клеткі.

У розныя гады менавіта на гэтай кафедры працавалі вядомыя ў нашай рэспубліцы навукоўцы: акадэмік А. С. Вечар, С. В. Калішэвіч, Л. С. Чаркасава. Доўгі час кафедру ўзначальваў Л. В. Кахновіч, а з 1991 года — прафесар В. М. Юрын.

Спецыялізацыя студэнтаў па кафедры фізіялогіі і біяхіміі раслін пачынаецца з 5-га семестра. Студэнты атрымліваюць тэарэтычную і метадычную падрыхтоўку па праблемах фотасінтэзу, дыхання, біяхіміі, гарманальнай рэгуляцыі, экалагічнай фізіялогіі, транспарту рэчываў, уздзеянню чужародных злучэнняў на розных узроўнях арганізацыі раслінnага арганізма (субклеткавым, клеткавым, арганным, усёй расліны). Усе студэнты, якія спецыялізуюцца па кафедры, прымаюць удзел у навукова-даследчай рабоце, і большая частка з іх да заканчэння універсітэта мае ўжо навуковыя публікацыі.

Кафедра падтрымлівае кантакты са многімі навуковымі ўстановамі АН РБ, Расіі, Грузіі, наладжваюцца кантакты з замежнымі навукоўцамі. Развіццё вучэбнага працэсу на кафедры шчыльна звязана з распрацоўваемымі навуковымі накірункамі, якія датычаць праблем фарміравання фотасінтэтычнага апарату ў онтагенезе пад уздзеяннем экза- і эндафактараў, рэгуляцыі транспарту рэчываў і радыёнуклідаў, мембранатропнага ўздзеяння ксенабіётыкаў і фізіялогіі імабілізаваных раслінных клетак.

На кафедры створана навуковая школа, якая грунтуецца на ўкараненні ідэй і метадаў электрафізіялогіі ў вырашэнні праблем рэгуляцыі працэсаў паступлення рэчываў у раслінную клетку і ксенафітафізіялогіі. Навуковую работу на кафедры праводзяць аспіранты, супрацоўнікі НДЛ, выкладчыкі кафедры. Публікацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў кафедры шырока вядомыя ў навуковым свеце як у нас, так і за мяжой. За 70 гадоў на кафедры падрыхтавана звыш 1500 спецыялістаў, многія з якіх сталі кандыдатамі і дактарамі навук.

А У ВАС?

НЕ КУРЫЦЬ!

Пасля наведвання Амерыкі рэктар Гродзенскага універсітэта Сяргей Аляксандравіч Мацкевіч забараніў студэнтам курыць не толькі ў сценах універсітэта, але і на яго ганку. Гэтае рашэнне было прынята яшчэ ў пачатку года, але ніхто не браў яго ў разлік. З пачаткам новага навучальнага года пачалася і антынікацінавая вайна ў Гродзенскім універсітэце. Цяпер усе (дэканы і прарэктары не выключэнне), каго заўважаць з цыгарэтай у руках, будуць пакараны.

Сам рэктар таксама курыць, але толькі дома ці на балконе. Ён лічыць, што акцыя, распачатая з мэтай падняць культуру ва універсітэце і паклапаціцца пра тых, хто не курыць, прымусіць і самых заўзятых курыльшчыкаў паклапаціцца пра сваё здароўе. У Амерыцы Сяргей Аляксандравіч аб'ехаў пяць штатаў і амаль не сустракаў людзей з цыгарэтай у руках.

А для тых, хто настолькі ўжо ўцягнуўся ў гэтую дрэнную звычку, што не ў стане яе пераадолець, ва універсітэцкім дворыку будуюць альтанку.

СЛУЖБА 03

Хто б мог падумаць, што ўсяго дзесяць гадоў таму казалі, што ў Мінску амаль няма сіфілісу. Потым агульную ўвагу прыцягнуў СНІД. Пра гэтую хваробу загаварылі на ўсіх мовах, а пра іншыя венерычныя захворванні нібы забылі.

КАЛІ САМАЛЯЧЭННЕ — РЫЗЫКА

Апошнія пяць гадоў у Мінску штодзённа паступаюць у бальніцу ад 5 да 12 чалавек з дыягназам "сіфіліс". Значная большая колькасць хворых, выяўленых пры абследаванні па розных іншых нагодах, праходзіць лячэнне ў скурвендыспансеры амбулаторна.

Сёння венерычныя захворванні ўсё часцей называюць хваробамі, якія перадаюцца палавым шляхам. І вядома іх зараз значна болей, чым раней: у навуковай літаратуры апісана больш за 80 захворванняў. Зараз у Мінску ёсць магчымасць дыягнаставаць і лячыць такія захворванні, як хламідыёз, мікаплазмоз, уреаплазмоз, гарднерэлез. Гэта актуальныя праблемы гінеколагаў, уролагаў і венеролагаў.

На вялікі жаль, сярод тых, хто хварэе на венерычныя хваробы, да 95 % складаюць маладыя людзі да 30-35 гадоў, у каго яшчэ ўсё жыццё наперадзе. А гэтыя інфекцыі паражаюць не толькі і не столькі палавую сістэму чалавека. Ідзе разбурэнне ўнутраных органаў: пячонкі, нырак, сэрца, мозгу, імуннай і касцявой сістэмы арганізму, вачэй.

Асобы, якія перанеслі венерычную хваробу, маюць няпэўны прагноз атрымання здаровых паўнацэнных нашчадкаў.

Вельмі небяспечна лячыцца самому. Часта пад уздзеяннем лекавых прэпаратаў прыкметы хваробы знікаюць. Хворы думае, што ён выздаравеў, а на самой справе хвароба прагрэсіруе.

Баючыся агалоскі, некаторыя лечацца не ў спецыяліста. Але ж агалоскі на самой справе і няма. Пра вірусаносьбітаў СНІДу ведаюць толькі ў цэнтры СНІД. У скурвендыспансеры існуе такая паслуга, як ананімнае платнае абследаванне, пры якім не запісваюць нават пашпартныя звесткі. Як пры абследаванні ў паліклініках, так і ў скурвендыспансеры захоўваецца ўрачэбная тайна, калі хворы выконвае правільны рэжым, указаны доктарам.

Існуюць меры прафілактыкі венерычных хвароб. Варта пазбягаць дашлюбных і выпадковых палавых сувязей, а ў сям'і захоўваць вернасць, павагу і каханне.

Пры згвалтаванні і выпадковых палавых сувязях рэкамендуецца на працягу дзвюх гадзін звярнуцца ў пункты супрацьвенерычнай дапамогі, якія працуюць кругласутачна, без рэгістрацыі прозвішча:

— вул. Прылуцкая, 4а, скурвендыспансер;

— вул. Ульянаўская, 32, паліклініка № 24;

— Старавіленскі тракт, 53, абласны скурвендыспансе́р.

Ёсць і індывідуальныя сродкі абароны: прэзерватыў, а таксама прэпараты цыдыпол і мірэстамін (у кожнай упакоўцы ёсць інструкцыя па іх прымяненню).

Пры з'яўленні нават сумненняў, а тым больш прыкметаў хваробы (боль, сып, сверб, трэшчыны, язвы ў месцы сексуальнага кантакту) найлепшы варыянт — звярнуцца да спецыяліста.

С. К. ШАБЕКА, заг. жаночай кансультацыі 33-й студэнцкай паліклінікі

СНЕЖНЫ КАМЯК НЯВЫРАШАНЫХ ПРАБЛЕМ

Наўрад ці знойдзецца сярод нас чалавек, які б хоць раз у жыцці не валіўся з ног ад стомы і не хварэў, няхай сабе нават банальнай прастудай. Калі стаміўся, дастаткова толькі адпачыць. Хваробу неабходна лячыць. Але ж нямногія з нас адчуваюць узаемасувязь гэтых двух станаў свайго арганізму. Калі не ўдавацца ў тэарэтычныя падрабязнасці, дык назапашаная стомленасць амаль заўсёды пагражае сур'ёзным захворваннем і часта робіць нават самае эфектыўнае лячэнне бессэнсоўным.

Прыкладаў працаголікаў, гатовых па розных прычынах не даваць сабе ні хвіліны на адпачынак і эканоміць нават на сне, хапае. А што вылучае добрапрыстойнага грамадзяніна з гэтага натоўпу людзей, шалёна прагных да нажывы, дзейнасці, поспеху? Аказваецца, для таго, каб падтрымліваць жыццядольнасць уласнага арганізму, ён будуе сваю дзейнасць па адной простай схеме, выдзяляючы на адпачынак гадзіну ў дзень, дзень у тыдзень, месяц у год. Адразу засведчу: такіх ідэальных сярод нас, на жаль, няма. Затое ўсё больш тых, хто страціў рэальную арыентацыю і не адносіць уласнае здароўе да шэрагу прыярытэтаў. А гэта практычна прамы шлях у дэпрэсію — цяжкую энергетычную хваробу, якая ўзнікае ад няўмення атрымліваць кампенсацыю ўзамен растрачаных сіл.

Пад уздзеяннем доўгатэрміновых фізічных, сацыяльных, псіхалагічных перагрузак арганізм трапляе ў стан стрэсу. Спачатку будзе зломлены дух, а затым цела адкажа той ці іншай хваробай. Стрэс б'е вельмі моцна па эндакрыннай сістэме: практычна "выключае" на пэўны час шчытападобную залозу, наносіць вельмі моцны ўдар па пячонцы, тая выкідвае атруту, якую накапіла, пачынаецца інтаксікацыя арганізму, "растарможваюцца" надныракнікі. У стрэсавым стане спусташаецца нервовая сістэма, сардэчна-сасудзістая, сонечнае спляценне страчвае шмат энергіі.

Апошнім часам на прыём да псіхатэрапеўтаў і неўрапатолагаў усё часцей прыходзяць маладыя мужчыны. Прычына сённяшніх іх стрэсаў — перагрузкі, звязаныя с наладжваннем уласнага бізнесу. Дарэчы, да групы рызыкі спецыялісты адносяць і сённяшніх студэнтаў, якія актыўна падрабляюць, а па начах праседжваюць за падручнікамі. Часцей за ўсё падобныя нервовыя зрывы здараюцца падчас самага напружанага часу для навучэнцаў — сесіі. Практычна здровы чалавек можа нават памерці ад таго, што нерацыянальна выкарыстоўваў недатыкальны запас жыццёвых рэсурсаў.

Стрэс можа прывесці да лятальнага зыходу. У 40-50-х гадах у Амерыцы паміралі маладыя мужчыны. Яны неверагоднымі намаганнямі дасягалі прафесійных, жыццёвых поспехаў, а затым пакідалі свет у росквіце гадоў. Гэта адбываецца зараз і ў нас. І што цікава, усё больш з мужчынамі. Таму што жанчыны больш трывалыя, гатовыя да таго, каб прыняць дапамогу псіхатэрапеўта, і таму своечасова яе атрымліваюць.

А яшчэ псіхолагі сведчаць, што кожны з нас надзелены геннай памяццю. Яна дыктуе нам сімпатыю ці антыпатыю да зусім незнаёмых месцаў ці выпадковага сустрэчнага. Любое канкрэтнае месца мае сваю "памяць" — энергетыку мінулага і сучаснага. Ёсць гіблыя месцы, дзе калісьці (магчыма, нават вельмі даўно) здзяйсняліся забойствы, злачынствы. Чалавек падсвядома імкнецца заставацца ўбаку ад іх.

У тыя месцы, дзе мы добра сябе адчуваем, трэба вяртацца. Дзе б мы ні падарожнічалі, мы абавязкова "натопчам" сваімі біяэнергетычнымі адбіткамі (як бы кавалачкамі самога сябе). Пакінутыя там, дзе нам калісьці было вельмі добра, адбіткі на ўзроўні падсвядомасці прываблівоць нас да сябе. Вярнуўшыся, каб пазбіраць іх, мы адчуваем сябе больш маладымі і здаровымі. Вось чаму заўсёды так прываблівоць родныя мясціны: яны падсілкоўваюць нас энергіяй.

Пры непераадольнай цязе да спасціжэння ўсяго свету часам не так і лёгка вызначыць, якую краіну выбраць для падарожжа ці адпачынку. Але трэба навучыцца давяраюць сваёй інтуіцыі. Збіраць як мага больш інфармацыі аб тым месцы ў турыстычных фірмах, у людзей, якія пабывалі там. Усё гэта патрэбна не толькі для таго, каб не апынуцца ў няёмкай сітуацыі ў чужой краіне, — для ўласнага псіхалагічнага камфорту таксама.

Дарэчы, наш арганізм нашмат разумнейшы за нас саміх. Як толькі ён адчувае, што прыйшоў час адпачыць, 90 працэнтаў падсвядомай жыццёвай энергіі ён накіроўвае на пошук месца, дзе гэта было б лепш зрабіць. Калі вы раптам у адзін зусім звычайны дзень адчулі, што трэба ісці ў адпачынак, — значыць, надыйшоў самы спрыяльны час для папаўнення жыццёвых сіл.

Ніколі не трэба пачынаць якую-небудзь новую справу, калі арганізм знаходзіцца ў мінусавой энергетычнай фазе, — ці гэта кантракт з партнёрам, ці камандзіроўка ў чужую краіну, ці адпачынак. Калі з самага пачатку нейкая справа ідзе лёгка і хутка —значыць, падзеі супалі ў рэзананс. І тады іх сума (поспех) будзе абавязкова вышэйшай, чым затрачаныя намаганні. Калі не, дык ёсць патрэба задумацца і памяняць намечаныя планы.

У адпачынку (ці падчас выхадных) усё трэба рабіць наадварот: не бачыцца з тымі, ад каго і без таго стаміўся за доўгі год. А ўспаміны пасля адпачынку яшчэ доўгі час можна выкарыстоўваць для таго, каб расслабляцца. Часам для таго, каб аднавіць свае сілы, дастаткова толькі прыгадаць блакітнае бясхмарнае неба і спакойнае мора. Нават крывяны ціск нармалізуецца, калі паспрабаваць у думках апусціць сваё цела ў спакойнае мора ці вярнуцца ў родныя мясціны.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6 Ум. друк. арк. 1

Падпісана ў друк у 12.00

26 ЛІСТАПАДА Зак 730. Т. 1000 экз.

Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 3, пакой 307, тэлефон 2206827.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Камп'ютэрная вёрстка А. Крывадубскай